Андруковіч Г.А., студ. гр. 402а ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Пазнякоў А.У.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ КАЛЕКЦЫІ З ФОНДАЎ БЕЛАРСКАГА ВІЛЕНСКАГА МУЗЕЯ ІМЯ ІВАНА ЛУЦКЕВІЧА І ВІРТУАЛЬНАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ АРХЕАЛАГІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблема віртуальнай рэканструкцыі і інтэрпрэтацыі артэфактаў археалагічнай спадчыны сёння шырока абмяркоўваецца ў Свеце, фрагментарная захаванасць вялікай часткі такіх артэфактаў у сукупнасці з забаронай уносіць змены ў аўтэнтычныя экспанаты выводзіць на першы план менавіта віртуальныя метады рэканструкцыі дзеля навуковых мэтаў і задачаў. Сярод накірункаў віртуальнай рэканструкцыі варта адзначыць найперш такія, як: узнаўленне незахаванаых фрагментаў аўтэнтычных экспанатаў; узнаўленне не захаванах, альбо недаступных для даследвання экспанатаў цалкам, на падставе выяваў экспанату; узнаўленне-інтэрпрэтацыя незахаваных экспанатаў па наратыўных крыніцах (апісаннях) [1]; стварэнне віртуальнага трохмернага вобразу-мадэлі экспанату дзеля інтэрпрэтатыўный і навуковых патрэбаў, а таксама дзеля патрэбаў папулярызацыі археалагічнай спадчыны.

Беларускі віленскі музэй імя Івана Луцкевіча, як найгалоўная беларуская культурніцкая установа ў першай палове 20 стаг., ставіў перад сабой задачу акумулявання ў сваіх фондах розных прадметаў беларускай спадчыны, раздзеленых па тэматычных калекцыях, археалагічная спадчына захоўвалася ў асноўным у наступных калекцыях:

- Калекцыя персьцянёў;
- Крыжы і абразкі з медзі;
- Дагістарычныя выкапні;
- Кафлі, цэглы і г.д. [2]

Вышэйпералічаныя экспанаты з’яўляюцца рознымі па сваім сутнасным змесце і, адпаведна, патрабуюць да сябе розных з пералічаных вышэй падыходаў і методыкаў. Гэтак, да прыкладу, пры працы з такімі экспанатамі з фондаў Музэя, як галаснікі Гарадзенскай Каloскай царквы вырашана правесці віртуалізацыю захаваных аўтэнтычных прадметаў; для працы ж з такім незахаваным напаўлегендарным экспанатам, як “Жазло Гедыміна”, адной толькі віртуалізацыі ня можа быць дастаткова, таму абраныя метад рэканструкцыі артэфакта паводле наратыўных крыніцаў, а таксама гэтак званая “адваротная рэканструкцыя”, ці то рэканструкцыя з рэканструкцыі, і толькі потым можа быць ужыты метад віртуалізацыі. [1]

Асабліва важна адзначыць працу па віртуальнай рэканструкцыі і інтэрпрэтацыі экспанатаў, якія цяпер захоўваюцця ў замежных музэйных фондах і недаступныя для беларускіх даследчыкаў, альбо нават уключаныя ў архітэктурныя структуры, як тое здарылася з экспанатамі Беларускага музэя №№427-435 (згодна з Інвэнтарнай кнігай) “Карнізы і блёкі вялікага разьмеру з каралеўскага замку ў Вільні (з вельмі цьвёрдае вапеннае заправы). Былі ўжыты некалі да фундамэнтаў невялікага дамочка на рагу Віленскае вул. і Ад. Міцкевіча, дзе знойдзены пры разборцы дому пад будову “дому Яблкоўскіх” у 1913-14 гг.” [2] - гэтыя экспанаты былі ўключаныя пару год таму ў сцены адноўленага палаца Віленскага ніжняга замка і як самастойныя музэйныя адзінкі перасталі існаваць. [1]

Віртуальная рэканструкцыя і інтэрпрэтацыя прадметаў беларускай старасветчыны адкрывае сур’ёзныя перспектывы для ўведзення іх у сур’ёзны навуковы ўжытак незалежна ад стану і лёсу аўтэнтычных экспанатаў, дазваляе папулярызаваць беларускую культуру на новым сучасным узроўні.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Інвэнтарная кніга Музэю ім. Ів. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні / падрыхт. і публ. У. Крукоўскі // Спадчына. 1995. № 5. – С. 187–190.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рукапіс матэрыялаў навукова-даследчай экспедыцыі ў Вільню за аўтарствам Андруковіч Г.А., Шулаева А.Л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ